**МІКАЛАЙ ГАЛАЎНЁЎ**

# КВЕТКІ БЕЛАРУСІ

## ЗБОРНІК ПЕСЕНЬ

МІНСК
ВЫДАВЕЦТВА «ЧАТЫРЫ ЧВЭРЦІ»
2015

УДК 821.161.3
ББК 84(Беи 6)
Г61

ISBN 978-985-7103-56-0

© Галаўнёў М. Р., 2015
© Усцінава Н. М., прадмова, 2015
© Афармленне. ТДА «Выдавецтва “Чатыры чвэрці”», 2015

# ЖЫЦЦЁ Ў ПЕСНІ

*Для мяне няма больш пачэснай справы, чым услаўляць у песнях свой родны край, сваю Бацькаўшчыну.*

Мікалай Галаўнёў

Песні таленавітага віцебскага кампазітара Мікалая Рыгоравіча Галаўнёва шырока вядомы не толькі на Віцебшчыне, але і ва ўсёй Беларусі. Розныя па тэме і жанру, яны вабяць сваёй шчырасцю, мілагучнасцю. Асобнае месца займаюць песні, прысвечаныя роднаму краю, баявым і працоўным подзвігам людзей, і таму многія самадзейныя і прафесійныя калектывы і выканаўцы ўключаюць іх у свой рэпертуар, як, напрыклад, Дзяржаўны акадэмічны народны хор імя Г. І. Цітовіча, ансамбль танца, музыкі і песні «Талака» Віцебскай абласной філармоніі і іншыя.

Асабліва моцная ў творчасці М. Галаўнёва лірычная плынь. У песнях «Гармонь», «Мосток березовый», «А жаўрук спявае…» яскрава адчуваюцца народныя матывы. Сам кампазітар гаворыць, што яго найбольш прывабліваюць хараство роднай прыроды, прыгажосць чалавечых пачуццяў, што так уласціва народнай песні.

У некаторых творах М. Галаўнёў выступае як аўтар не толькі музыкі, але і слоў, раскрываючы такім чынам самабытны талент паэта-песенніка. Кампазітар піша музыку таксама і на словы вядомых беларускіх паэтаў, такіх як: Пімен Панчанка, Зіновій Прыгодзіч, Рыгор Сітніца, Генадзь Бураўкін, Таісія Бондар і іншыя.

Першы зборнік песен Мікалая Галаўнёва быў выдадзены ў Віцебску ў 2004 годзе пад мілагучнай назвай «Край мой любы, дарагі…», другі — «А жаўрук спявае» — у 2013 годзе.

У дадзенае выданне ўвайшлі як новыя творы, так і некаторыя ранейшыя. Прадстаўленыя ў ім песні ўзбагацяць рэпертуар не толькі самадзейных, але і прафесійных калектываў.

***Н. М. Усцінава,***
*член Саюза кампазітараў*
*Рэспублікі Беларусь*

*Памяці бацькоў прысвячаю*

Шэрая зязюля ў лесе кукавала,
Мне вясны далёкай згадкі прыгадала.
За сяло пайду я сцежкай нацямочку,
Дзе плывуць над полем нізка туманочкі.

Як у маленстве ціха веснічкі адкрыю,
Ой вы, туманочкі, дайце свае крылы.
Палячу я з вамі птушкаю ў вырай,
Я да роднай хаты ў куточак мілы.

Дзесьці там далёка ў бацькоўскім краі,
Там мяне матуля з таткаю чакаюць.
Узыйду на ганак, — успыхне свет у акенцы,
Зноў пачую крокі ціхія ў сенцах.

Знаю, не вярнуцца мне туды ніколі,
І плывуць удалеч туманы, як мроі.
Ой вы, туманочкі, полем вы плывіце,
У душы збалелай смутак не будзіце.

*Мікалай Галаўнёў*

# А ЖАЎРУК СПЯВАЕ

Словы і музыка М. Галаўнёва

**Не спяшаючыся, напеўна**



Дзе цвітуць рамонкі ў жытнёвым полі
І блакітам свеціць васілёк,
Жаўрукова песня льецца на прыволлі,
Нібы срэбразвонны ручаёк.

*Прыпеў*:

А жаўрук спявае, а жаўрук спявае,
Песняй сустракае новы дзень.
А над Белай Руссю, па-над небакраем
Сонейка ўзыходзіць, гоніць смутку цень.

Гойдае вятрыска гэты спеў дзівосны,
На празрыстых крылах паўстае.
І з чароўных гукаў, нібыта на кроснах,
Тчэ жаўрук мелодыі свае.

*Прыпеў*.

Ты яго паслухай, мо тут скрыпка грае,
Мо цымбалы струнамі звіняць?
Ад пачуццяў светлых уся душа лунае,
Радасці ў сэрцы не суняць.

*Прыпеў*.

Вось і мне б той птушкай у неба, пад аблокі
Узляцець над роднаю зямлёй,
І ўславіць у песнях край мой сінявокі,
Беларускі край бацькоўскі мой.

*Прыпеў*.

# Змест


ЖЫЦЦЁ Ў ПЕСНІ. *Н. М. Усцінава* . . . . . 3
*Памяці бацькоў прысвячаю* . . . . . *4*
А жаўрук спявае . . . . . 5
Залаты дождж . . . . . 7
Беларусь — мая песня . . . . . 9
Танго нашей любви . . . . . 11
Гармонь . . . . . 17
Бярозавы вецер . . . . . 19
А ў лузе, у зялёным . . . . . 21
Квітней, Беларусь! . . . . . 23
Новогодний вальс . . . . . 25
Стрэў дзяўчыну я адну . . . . . 27
Мосток березовый . . . . . 29
Песенка про нас с тобой . . . . . 31
Тапаліны звон . . . . . 33
Анютины глазки . . . . . 37
Франтавыя сяброўкі . . . . . 39
Матуліны рукі . . . . . 41
Навагодняя песенька . . . . . 43
Званок у мінулае . . . . . 45
Оркестр играет марш . . . . . 50
Где живут соловьи . . . . . 54
Я вясковая дзяўчына . . . . . 56
Перепутался хмель с повиликой . . . . . 58
Выйду ў лугі . . . . . 60
Песня родная . . . . . 62
Кветкі Беларусі . . . . . 64
Цёплаю раніцай . . . . . 68
Когда гитара тихо плачет . . . . . 70

Толькі дома . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 74
Сказочная фея . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 76
Фронтовой снимок . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 78
Над ракой каліна . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 80
У зялёным гаёчку вясна . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 82
Табой жыву... . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 84
Обида . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 86
Прылячу да цябе . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 88
Завушніца вечнасці . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 90
Край мой любы, дарагі... . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 92
Дзікая шыпшына . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 94
Святая крыніца . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 96
На Івана Купала . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 98
Прысвячэнне . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 100
Кукушка . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 102
Радзіма . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 104
Ночка варажбітная . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 106
Пацвіці яшчэ, рабіна... . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 107
Вясновы сон. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 109
Чарацянка. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 112
Слава твая, Беларусь . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 114